# Знайсці страчанае

**У музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё выстаўкі «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага», прымеркаванай да Дня бібліятэк.**

У наступным годзе праекту будзе 20 гадоў. Сёння на выстаўцы экспануюцца найбольш каштоўныя аб'екты з фонду грамадскага дзеяча і калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава, які арганізаваны ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з мэтай пошуку, выяўлення, вяртання і захавання дакументальнай спадчыны Беларусі.

Дакументы з яго фонду датуюцца XVI—XX стагоддзямі. Калекцыя ўключае ўнікальныя рукапісныя дакументы, старадрукаваныя і рэдкія кнігі, перыядычныя выданні. Увазе наведвальнікаў прадстаўлены асобнікі, набытыя пры падтрымцы дзяржавы, падораныя бібліятэцы і перададзеныя на дэпазітарнае захоўванне. Сярод іх — унікальныя рукапісныя рэгістрацыйныя кнігі культавых устаноў XVIII—XIX стагоддзяў, унікальны рукапіс беларускіх татар, старадрукі XVIII стагоддзя.

«Адна з грамат — прывілей Жыгімонта III Вазы мінскаму ўніяцкаму манастыру з калекцыі Тышкевічаў. Усе дакументы, падпісаныя Жыгімонтам III, — бібліяграфічная рэдкасць. Але гэты дакумент вельмі радкі, бо не на польскай мове, а на нашай. Яго можна назваць старабеларускім, беларускім, стараруcкім, славянскім. Але я кажу на нашай мове — напісаны кірыліцай і лёгка чытаюцца, — паведаміў на адкрыцці Уладзімір Ліхадзедаў. — Полацкая грамата — яшчэ адзін значны дакумент, датаваны XVI стагоддзем. Ён напісаны ў 1596 годзе ў Рэчы Паспалітай, але зноў жа на нашай мове».

Дэманструюцца экзэмпляры адной з першых беларускіх газет XIX ст. — «Гродзенскія губернскія ведамасці», выданні, прысвечанныя перыяду Напалеонаўскіх войнаў, дакументы перыяду Першай сусветнай вайны, Вялікай Айчыннай вайны і інш. Бібліятэчную прастору ўпрыгожваюць арт-аб'екты, выкананыя ў межах аўтарскага праекта Уладзіміра Аляксеевіча.

Калекцыянер з вялікай любоўю расказаў пра больш значныя дакументы, а таксама вызначыў асноўную мэту выстаўкі: «І кнігі, і розныя дакументы, матэрыялы знаходзяцца тут, каб людзі маглі вывучаць сваю гісторыю. Гэта і ёсць галоўная мэта — вывучэнне, захаванне, папулярызацыя беларускай гісторыі».

Выстаўка працуе да 15 кастрычніка.

**Ксенія МОЖАР**

## Віншуем з узнагародай!

Напярэдадні Дня бібліятэк у Нацыянальнай бібліятэцы былі ўручаны ўзнагароды найлепшым установам, якія праявілі сябе ў розных кірунках. Не засталася па-за ўвагай і Астравецкая раённая бібліятэка, якая стала пераможцам XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры». Дырэктар установы Наталля Ачарэтава прымала дыплом першай ступені з рук Валерыя Грамады, першага намесніка міністра культуры. Цырымонія ўзнагароджання стала не толькі святам для пераможцаў, але і магчымасцю для бібліятэкараў абмяняцца вопытам і ведамі. Віншуем з узнагародай!

**Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ**